Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

3 СНЕЖНЯ 2016 г. СУБОТА № 234 (28344)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Мінск не згубіць свой «Вянок»

СТАР. 9

Разьбяная ліштва – сусвет на тваім акне

СТАР. 12

«Еўрабачанне – 2017»: здзівіць і «адарвацца»

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Андрэй КАБЯКОЎ, прэм'ер-міністр

«Кіраўніцтва кампаній звяртае ўвагу ўрада на адно істотнае пытанне — магчымасць прыцягнення крэдытных сродкаў па як мага больш нізкіх крэдытных стаўках. Гэта агульнаэканамічная праблема, якая патрабуе вырашэння. Урад паслядоўна вырашае гэтую задачу. Па новых крэдытах, якія выдаюцца ў беларускіх рублях, на пачатак года працэнтная стаўка была каля 33%, цяпер гэта 21—22%. Ёсць цэлы шэраг прадпрыемстваў, у якіх стаўка значна меншая — 17—18%. Задача заключаецца ў тым, каб да канца наступнага года гэтыя 17—18% гадавых былі для ўсіх тых, каго можна крэдытаваць».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 3.12.2016 г.

Долар ЗША	1,9703	▲
Еўра	2,1019	▲
Рас. руб.	0,0307	▼
Укр. грыўня	0,0760	▼

ISSN 1990 - 763X

СНЕЖАНЬСКІ «ЎРАДЖАЙ»

У Мазырскім доследным лясгасе ва ўсю рыхтуюцца да навагодніх свят. У спецыялізаваным гадавальніку Слабадскога доследна-вытворчага лясніцтва, дзе вырошчваецца больш за тры тысячы саджанцаў, пачалі адбор і сартаванне дрэўцаў, каб напярэдадні Новага года можна было аператыўна высекчы і прапанаваць елкі ў продаж. Зялёныя прыгажуні паедуць адсюль у Мазыр, Гомель, Калінкавічы. У майстра лесу Марыі КАЧЭНІ, якая працуе на адборы, добры настрой: яна ведае, што яе гадаванцы прынясуць людзям радасць.

Фота БЕЛТА.

БАНК ПРАВА

НЦПІ забяспечвае стабільнае развіццё дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі

Першая нядзеля снежня — традыцыйна святочная для ўсіх прафесійных юрыстаў. Напярэдадні гэтай даты «Звязда» пагаварыла з дырэктарам Нацыянальнага цэнтра прававой інфармацыі, кандыдатам юрыдычных навук, дацэнтам Яўгенам КАВАЛЕНКАМ пра прававую інфарматызацыю ў краіне і ролю, якую адыгрывае ў Беларусі падначаленая яму арганізацыя.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Яўген Іосіфавіч, найперш раскажыце, якія функцыі ўскладзены на Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі?

— Нацыянальны цэнтр прававой інфармацыі — гэта цэнтральная навукова-практычная арганізацыя, якая ажыццяўляе збор, улік, апрацоўку, захаванне, сістэматызацыю і актуалізацыю эталоннай прававой інфармацыі, яе распаўсюджванне. Іншымі словамі, забяспечвае функцыянаванне і развіццё дзяржаўнай сістэмы прававой інфармацыі.

СТАР. 4

■ Сацыяльныя праекты

ЗаПРАГРАМАваць на жыццё

Для інвалідаў створаць ІТ-курсы і дапамогуць знайсці прэстыжную работу

На сталічным кірмашы вакансій, што праходзіў у лістападзе, у секцыі «Занятасць без межаў» прапаноўвалі работу інвалідам. Іх гатовы былі ўладкаваць дыспетчарамі, сантэхнікамі, адміністратарамі вэб-сервера. Героі гэтага матэрыялу ўпэўнены: спіс прафесій, дзе можа сябе праявіць чалавек з асаблівасцямі ў развіцці, куды большы. І гатовы дапамагчы іншым знайсці работу. На сёлетнім конкурсе сацыяльных праектаў Social Weekend прэзентуюць адразу два адукацыйныя курсы для людзей з інваліднасцю.

«НАС АРЫЕНТУЮЦЬ НА ЗАВОД»

Нядаўна **Максім МОЛНАР** атрымаў прэстыжную прафесію — 3D-дызайнер. Цяпер хлопец спрабуе ўладкавацца на работу: адна амерыканская фірма выслала яму тэставае заданне. Прызнаецца, што ў ідэале хацеў бы працаваць у гульнявой сферы, у кампаніі, дзе ў калектыве ёсць людзі, якія чуюць і якія не.

СТАР. 7

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА,
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на I квартал і I паўгоддзе 2017 года!
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!